■ Тры пытанні да ўлады

# КУРС НА МОЦНУЮ ЭКАНОМІКУ



**Касцюковіцкі раён вядомы дзякуючы Беларускаму цэментнаму заводу, лясгасу і шэрагу іншых эфектыўна працуючых прадпрыемстваў. Апошнім часам тут дастаткова дынамічна развіваецца сацыяльная сфера — узводзяцца гандлёвыя цэнтры, жыллё, спартыўныя аб'екты. Сёлета ў Касцюковічах быў цалкам здадзены фізкультурна-аздараўленчы комплекс агульнай плошчай больш за 6 тысяч квадратных метраў, што дало магчымасць вырашыць адразу некалькі праблем — павялічыць экспарт турыстычных паслуг, стварыць новыя працоўныя месцы і забяспечыць раён добрай спартыўнай базай. Зроблены шэраг захадаў па паляпшэнні прадукцыйнасці працы і своечасовай выплаце заработнай платы. Адбыліся станоўчыя зрухі і ў развіцці прыватнага бізнесу. Больш падрабязна на гэты конт мы пагутарылі з намеснікам старшыні Касцюковіцкага райвыканкама па эканамічных пытаннях Любоўю КІСЯЛЁВАЙ.**

***— Другая чарга ФАКа ўступіла ў дзеянне зусім нядаўна, 26 красавіка. Наколькі запатрабаваным аказаўся гэты аб'ект і ці можна ўжо сёння казаць пра нейкі ўплыў яго на эканоміку раёна?***

— Толькі дзякуючы кіраўніку краіны Аляксандру Лукашэнку, губернатару Магілёўскай вобласці Уладзіміру Даманеўскаму і старшыні Магілёўскага аблсавета на той момант, а цяпер памочніку Прэзідэнта па Мінскай вобласці Анатолю Ісачанку сёлета для завяршэння будаўніцтва была выдзелена канчатковая сума па «чарнобыльскай» праграме. На будоўлю спартыўнага комплексу былі накіраваны таксама сродкі раённага суботніка. І, што хочацца падкрэсліць, больш за 2,1 мільёна рублёў на гэты аб'ект сабралі нашы прадпрыемствы і жыхары. Цяпер мы маем доўгачаканы фізкультурна-аздараўленчы цэнтр з універсальнай спартыўнай залай для гульнявых відаў спорту з трыбунамі на 750 месцаў, басейнам на 5 дарожак даўжынёй 25 метраў, трэнажорнай залай, заламі для заняткаў фітнесам, боксам, дзюдо. Касцюковіцкі раён заўсёды ганарыўся сваімі спартсменамі, асабліва ў дзюдо і цяжкай атлетыцы. Дастаткова ўспомніць сярэбранага прызёра Алімпіяды ў Рыа-дэ-Жанэйра Вадзіма Стральцова. Летась наш раён праславіла яшчэ і юная самбістка Анфіса Капаева, якая заваявала серабро на Кубку свету ў Маскве. Што датычыцца басейна, то тут нават і сумнявацца не трэба ў яго запатрабаванасці. У нас шмат моладзі, за апошнія гады ў Касцюковічах вырас цэлы жылы маладзёжны мікраараён. Адпаведна і нараджальнасць расце. Раней, каб школьнікі маглі здаць нарматыў па плаванні, мы іх вазілі ў Клімавіцкі раён. А зараз графік складзены так, каб кожная школа, у тым ліку сельская, магла паўнавартасна займацца. Створаны групы сярод працоўных калектываў, ужо нават прайшло некалькі раённых спаборніцтваў паміж рознымі арганізацыямі. Праводзяцца спаборніцтвы сярод школьнікаў. Прыязджаюць наведвальнікі з Хоцімскага раёна, з суседняга Суражскага раёна Расійскай Федэрацыі. Адным словам, комплекс працуе з раніцы да позняга вечара. У нас адчувальна павысіўся экспарт турыстычных паслуг, а галоўнае, у два разы па першым квартале было перавыканана заданне па стварэнні працоўных месцаў. І на 50% гэта звязана з уводам у эксплуатацыю ФАКа.

***— Раён з'яўляецца адным з сямі, якія, згодна з Указам 235, увайшлі ў праграму развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна. Як працуе гэты закон? Ці ёсць чым тут пахваліцца?***

— Нядаўна быў пабудаваны 60-кватэрны дом, у якім 27 грамадзян атрымалі льготны крэдыт пад 1% гадавых. У рамках гэтага ж закона запрацаваў аб'ект грамадскага харчавання на 50 пасадачных месцаў. Развіваецца прыватны бізнес, укладаючы грошы ў сферу паслуг. Сёлета ў Касцюковічах запрацаваў сучасны гандлёвы цэнтр «Востраў чысціні» плошчай 255 квадратных метраў. Яшчэ адну вельмі запатрабаваную краму будаўнічых матэрыялаў адкрыў індывідуальны прадпрымальнік. Яе плошча 204 квадратныя метры. Гаспадар паклапаціўся, каб быў прывабны дызайн, якасна афармленыя вітрыны, высокі сэрвіс абслугоўвання.

Дзякуючы беларуска-нямецкім інвестарам развіваецца альтэрнатыўная энергетыка. Першая станцыя магутнасцю 1,5 МВт ужо ўведзена ў эксплуатацыю. І, што вельмі прыемна, спрацавала дастаткова прыбытковa, нягледзячы на тое, што быў не сонечны квартал. Разлічваем на добрыя дывідэнды і ў далейшым. Яшчэ на тэрыторыі будуюцца 2 станцыі па 1,5 МВт кожная. Адну з іх плануецца запусціць ужо сёлета.

***— На якім узроўні знаходзіцца ў раёне выкананне прагнозных паказчыкаў? У чым атрымалася дасягнуць больш спрыяльных вынікаў?***

— Сёлета станоўчыя тэндэнцыі замацаваліся ў розных галінах эканомікі. У 1-м квартале плённа працавалі па прасоўванні прадукцыі за межы краіны. У сувязі з паляпшэннем кан'юнктуры на рынку цэменту, павялічыўся аб'ём яго экспарту ў Расію. Сёлета пачалі ажыццяўляць пастаўкі гэтага будаўнічага матэрыялу на Украіну, а таксама вярнуліся на рынак Калінінградскай вобласці. Усяго за першы квартал адгружана на экспарт больш за 135 тысяч тон цэменту на агульную суму 6,2 мільёна долараў ЗША — у 2,2 раза больш, чым за аналагічны перыяд летась. Усё гэта добра паўплывала на рост аб'ёмаў экспарту тавараў і паступлення валюты. Сёлета змаглі пераламаць сітуацыю па экспарце тавараў на прадпрыемствах, падпарадкаваных райвыканкаму і райсавету дэпутатаў — у 9 разоў перавысілі заданне 1-га квартала. На працягу апошніх некалькіх гадоў гэты паказчык быў у нас не ў лепшым стане. Нядрэнна развіваецца і экспарт паслуг. Калі летась гэта былі на 70% транспартныя, то сёлета ўпершыню быў наладжаны экспарт будаўнічых, а таксама, як я ўжо казала, за кошт уводу ў дзеянне басейна адчувальна павялічыўся экспарт турыстычных паслуг.

У першым квартале мы забяспечылі выкананне аб'ёму валавой прадукцыі сельскагаспадарчымі арганізацыямі, што не атрымлівалася зрабіць летась. Такая форма кантролю як абарона зарплаты дазволіла стабілізаваць сітуацыю на слабых прадпрыемствах. А ўкараненне ў сельскай гаспадарцы забытай формы — гаспадарчага разліку — дало стымул працаваць на вынік і гэтым забяспечваць своечасовую выплату заработнай платы. Матывацыя для ўсіх адна — зарплата абавязкова павінна быць зароблена. І мы няўхільна выконваем суадносіны паміж прадукцыйнасцю працы і зарплатай, каб не дапусціць «праядання» абаротных сродкаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# БЛІЖЭЙ ДА ПЕРШЫХ

**За апошнія дзесяць гадоў Беларусь паднялася з 128-га на 37-е месца па рэйтынгу Doing Business Сусветнага банка. Пра гэта нагадаў кіраўнік прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі Ян Чул КІМ на сустрэчы са старшынямі пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.**

Дэпутатам былі прадстаўлены вынікі комплекснага даследавання эканамічнага развіцця нашай краіны. **Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Уладзіслаў ШЧЭПАЎ** адзначыў, што гэта вельмі важна, «паколькі менавіта ў дадзены момант разглядаюцца праекты нарматыўна-прававых актаў і прагнозу развіцця краіны на бліжэйшы год і на трохгоддзе».

Ян Чул Кім прапрацаваў у Беларусі тры з паловай гады і ў жніўні збіраецца пакінуць сваю пасаду. За гэты час ён даволі добра вывучыў стан эканомікі краіны і вось якія зрабіў вывады: «Я аптымістычна настроены адносна будучыні Беларусі. За апошнія два гады, калі эканоміка адчувала асаблівыя цяжкасці, нягледзячы на іх, назіраліся паслядоўныя макраэканамічныя рэформы. Глабальная эканоміка аднаўляецца пасля цэлага шэрагу перыядаў нізкіх узроўняў росту, і гэты момант з'яўляецца яшчэ адной магчымасцю для Беларусі, каб заявіць пра сябе на сусветным рынку».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Падзея

# ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ І ЭКСПАРТ

**Танец трактароў, экскаватары, здольныя стаяць на аўтрыгерах (вынасных апорах) пад неймавернымі вугламі і забіваць каўшом тонкія цвікі... На прадпрыемстве «Амкадор» ведаюць, як здзівіць публіку. Менавіта так святкавалі адкрыццё холдынга «Амкадор-Семаш», што спецыялізуецца на выпуску машын і агрэгатаў для сельгасвытворцаў.**

Плануецца, што ў вытворчай лінейцы холдынга будуць створаны сельскагаспадарчыя агрэгаты і машыны для апрацоўкі глебы, сяўбы, паліву і ўнясення ўгнаенняў, аховы раслін, уборкі збожжавых і зернебабовых, караня- і клубнеплодаў, а таксама абсталяванне для пасляўборачнай апрацоўкі і захоўвання збожжа. У склад холдынга ўвайшлі прадпрыемствы «Амкадор-Можа» і «Амкадор-Семаш». Вядзецца таксама работа па ўключэнні ў холдынг «Амкадор-Двмз» і «Элезер». Усе ўдзельнікі арганізацыі ўяўляюць сабой адзіны тэхналагічны рад, пры гэтым кожны выпрабляе сваю наменклатуру дэталяў, вузлоў і агрэгатаў машын «Амкадор».

У магутнасці па выпуску сельскагаспадарчых машын і агрэгатаў плануецца ўкласці больш за 150 млн долараў. Сума вялікая, але апраўдвае мэту — ідзя развіцця холдынга накіравана на дасягненне 100-працэнтнага імпартазамяшчэння і лакалізацыі вытворчасці на тэрыторыі краіны. Гэта азначае хуткае асваенне вытворчасці абсалютна ўсёй лінейкі сельскагаспадарчых машын, абсталявання і агрэгатаў, якія адпавядаюць сусветным стандартам.

Па словах **старшыні Савета дырэктараў «Амкадор» Аляксандра ШАКУЦІНА,** «Амкадор-Семаш» за тры гады павінен выйсці на аб'ём вытворчасці ў 100 млн долараў пры ўмове, што будуць хутка рэалізаваны інвестыцыйныя праграмы, атрымаецца стварыць новыя прадпрыемствы і мадэрнізаваць заводы, якія ўваходзяць у склад холдынга. Пры гэтым ён падкрэсліў, што 50% прадукцыі будзе пастаўляцца на экспарт.

У невялікім раённым цэнтры будзе створана больш за тысячу працоўных месцаў, паведаміў **намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА.** Акрамя таго, заводы новага холдынга сфарміруюць канкурэнтнае асяроддзе для ўсёй галіны, дзякуючы таму, што вытворчасці, якія ўваходзяць у «Амкадор-Семаш», ствараюцца на самым сучасным тэхналагічным узроўні, купляецца найноўшае абсталяванне, прымяняюцца перадавыя тэхналогіі.

«Думаю, трэба і іншым нашым прадпрыемствам разумець, што месца хопіць усім і ў Беларусі, і за яе межамі, але трэба быць канкурэнтаздольнымі. Мы ж — краіна з адкрытай эканомікай, нам трэба 70% прадукцыі і паслуг прадаць на экспарт, каб жыць і развівацца», — падкрэсліў Уладзімір Сямашка.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Рэйтынг папулярнасці Трампа ўпаў да рэкордна нізкага ўзроўню

Рэйтынг незадаволенасці прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам абнавіў свой максімум, падняўшыся яшчэ на адзін працэнтны пункт, і дасягнуў 60%. Пра гэта сведчаць апублікаваныя вынікі апытання, арганізаванага сацыялагічнай службай Gallup International, якая вядзе даследаванне на штодзённай аснове. Паводле апошніх звестак, кіраўніка дзяржавы падтрымліваюць толькі 36% амерыканцаў. У красавіку сацапытанне, праведзенае The Washington Post сумесна з ABC News, паказала, што пасля 100 дзён прэзідэнцтва Дональд Трамп стаў адным з самых непапулярных амерыканскіх лідараў за ўсю гісторыю Злучаных Штатаў. Дарэчы, 14 чэрвеня гаспадару Белага дома споўніўся 71 год.

### Напалоханыя брэксітам брытанцы накіраваліся па нямецкае грамадзянства



Рэкордная колькасць брытанцаў звярнулася па нямецкае грамадзянства. Па звестках нямецкага статыстычнага ведамства, летась 2865 падданых Злучанага Каралеўства падалі заяўку на атрыманне грамадзянства ФРГ. Годам раней такіх было ў тры з паловай разы менш. Акрамя таго, брытанцы таксама выказалі павышаную цікавасць да грамадзянства Італіі, Швецыі, Польшчы і Венгрыі. Калі Злучанае Каралеўства выйдзе з Еўрасаюза (відавочна, гэта здарыцца ў сакавіку 2019 года), то яго падданыя хутчэй за ўсё страцяць права жыць і працаваць у 27 краінах — членах міждзяржаўнага аб'яднання.

### Калумбійскія паўстанцы здалі 60% узбраення

Калумбійская паўстанцкая групоўка «Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы Калумбіі» (РУСК) здалі пад кантролем міжнароднай місіі ААН 60% свайго арсенала ў рамках выканання ўмоў мірнага пагаднення з урадам. Пра гэта паведаміў прэзідэнт Калумбіі Хуан Мануэль Сантас. «На наступным тыдні будуць здадзены ўсе 100%», — адзначыў ён. Прэзідэнт ахарактарызаваў пагадненне аб міры з РУСК як добра прадуманае і эфектыўнае.

### Еўракамісія пачала расследаванне супраць Польшчы, Венгрыі і Чэхіі за адмову прыняць мігрантаў



Вынікам гэтай працэдуры могуць стаць буйныя грашовыя штрафы для краін-парушальніц. У якасці самай суровай меры пакарання, якая, зрэшты, нi разу не ўжывалася, гэтыя дзяржавы могуць быць пазбаўлены права голасу ў Савеце ЕС. Увосень 2015 года краіны ЕС прынялі рашэнне аб рассяленні па сваёй тэрыторыі 160 тысяч мігрантаў. Квоты размяркоўваліся прапарцыйна насельніцтву краін ЕС і шэрагу іншых фактараў. За апошнія два гады Польшча і Венгрыя не прынялі ні аднаго мігранта, Чэхія ўзяла 12 чалавек.

# Жахлівая ноч

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Лічылася, што Грэнфел-таўэр пабудаваны ў адпаведнасці з высокімі патрабаваннямі пажарнай бяспекі. Новыя ўваходныя дзверы ў кожную кватэру нібыта маглі вытрымліваць агонь да 30 хвілін, а гэтага цалкам дастаткова для прыбыцця пажарнай брыгады. Тым не менш на справе ўсё аказалася зусім па-іншаму. BBC паведамляе: па словах некаторых жыхароў, агонь ахапіў увесь дом ужо праз 15 хвілін. Сведкі здарэння спачатку бачылі, як загарэлася кватэра на адным з паверхаў у ніжняй часткі вышыннага дома, але на іх вачах пажар імкліва распаўсюдзіўся па абліцоўцы будынка.

Ёсць і больш шакіруючая інфармацыя: відавочцы з суседніх дамоў распавялі, што бачылі людзей, якія падавалі сігналы аб дапамозе, у роспачы скакалі з верхніх паверхаў, выкідвалі ў вокны дзяцей, спрабавалі спусціцца па вяроўках, зробленых з прасцін.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*